# Першачарговая задача—выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай

## З прамовы старшыні СНК БССР тав. Н. М. Галадзеда на усебеларускай нарадзе раённых упаўнаважаных па загатоўках*)

Практыка хлебазагатовак за апошнія гады паказала, што партыя і ўрад дабіліся вялікіх поспехаў у справе наладжання работы па хлебапастаўках, своечасова разграмілі кулацкі сабатаж і ў асноўным зламалі антыдзяржаўныя тэндэнцыі.

Вы, райупаўкамзагі, работнікі, пастаўленыя партыяй спецыяльна па справу хлебазагатовак, адыгралі ў наладжанні гэтай важнейшай работы немалую ролю, як прадстаўнікі саюзных органаў, незалежныя ад мясцовых арганізацый, і поўнасцю сябе апраўдалі на гэтым важнейшым участку работы.

Наша партыя і ўрад дабіліся вялікіх поспехаў і ў сэнсе павароту шырокіх мас калгаснікаў на шлях першачарговага выканання дзяржаўных абавязацельстваў.

Нямала людзей з савецка-гаспадарчага апарата ў свой час прышлося пабіць за праяўленне яўна-месніцкіх антыдзяржаўных тэндэнцый. Але апошнія пару гадоў, асабліва 1934 год, паказалі, што ўсе нашы раённыя партыйныя і савецкія арганізацыі сур'ёзна папрацавалі над выкарчоўваннем месніцкіх тэндэнцый у справе выканання дзяржаўных абавязацельстваў і паказалі ўзоры сур'ёзнай большэвіцкай работы на ўсіх галінах. Дзякуючы поспехам калектывізацыі і замацаванню калгасаў і дзякуючы той рабоце, якая праведзена ўсёй партыяй, і рабоце, якая праведзена ўсімі партыйна-савецкімі арганізацыямі БССР, мы дабіліся такога становішча, што асноўная маса калгаснікаў добрасумленна адносіцца да выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай і ўжо большая частка калгасаў у сваёй рабоце ва главу вугла ставіць задачу — перш за ўсё разлічыцца з дзяржавай па сваіх абавязацельствах. Аднак, сярод некаторых работнікаў нашага апарата і да гэтага часу ёсць яшчэ людзі, якія да выканання абавязацельстваў перад дзяржавай адносяцца па меншай меры з халадком, а ёсць яшчэ і такія людзі, якія адлюстроўваюць яўна-кулацкія антыдзяржаўныя тэндэнцыі.

Трэба падкрэсліць, што не выключана магчымасць варожа-кулацкага ўплыву на асобных работнікаў раёна і сяла і ў справе хлебапаставак 1935 года. Гэта трэба мець абавязкова на ўвазе.

У апаратах райза, райплана і іншых апаратах раёна яшчэ засталіся людзі, якія з знадворнага боку паказваюць сябе нібыта дзяржаўнымі дзеячамі, а на самой справе «пацiхеньку» ў практычнай рабоце падсоўваюць кіраўнікам раёна несавецкія дакументы, а асобныя кіраўнікі штампуюць, кладуць сваю пячатку на гэтых дакументах. Гэта азначае, што антысавецкія элементы, якія яшчэ засмечваюць наш апарат, націскаюць на нашых кіраўнікоў раённых арганізацый, а некаторыя кіруючыя работнікі не ў сілах даць адпор гэтаму націску і тым больш няздольны выкрыць антысавецкія элементы, якія яшчэ не вытрахнуты з савецка-гаспадарчага апарата. Гэта азначае, што ў гэтых выпадках справа з рэвалюцыйнай большэвіцкай пільнасцю зусім не ў парадку. Няма гэтай пільнасці, неабходнай кожнаму работніку.

Мы ні ў якім разе не павінны супакоіцца на дасягнутых поспе-



хах у справе хлебапаставак, бульбапаставак, выканання льнозагатовак і іншых, а наадварот, яшчэ больш арганізавацца, лепш падрыхтавацца і, самае галоўнае, рашуча і бязлітасна ламаць і выкарчоўваць астаткі процідзяржаўных тэндэнцый, завастраючы ўсё больш рэвалюцыйную пільнасць.

Гэта задача з'яўляецца галоўнай як для ўпаўнаважаных па хлебапастаўках, так і для ўсіх раённых кіруючых арганізацый. Калі пра гэту задачу забудзеце, то справа не зможа пайсці наперад.

Другое пытанне, якое я хачу закрануць у сваім выступленні, — гэта аб узаемаадносінах райупаўнаважаных камітэта загатовак з раённымі арганізацыямі. Закранаю я гэта таму, што не ўсюды гэтыя ўзаемаадносіны нармальны.

Першае і асноўнае, чаго вам непатрэбна забываць у сваёй рабоце, — гэта тое, што **вы з'яўляецеся ўпаўнаважанымі камітэта загатовак пры Савеце Народных Камісараў Саюза ССР.** Гэта значыць, вы з'яўляецеся **самастойнымі, незалежнымі ад мясцовых органаў** работнікамі ў справе паставак хлеба, бульбы і інш. А сей-той з вас гэта забывае.

Часамі дробязі пачынаюць уплываць на некаторых райупаўкамзагаў і яны пачынаюць «зрастацца» з мясцовымі арганізацыямі і пачынаюць адлюстроўваць чыста мясцовыя настроі.

Гэта зусім недапушчальна, бо асноўнае і важнае — не забываць, што вы з'яўляецеся прадстаўнікамі **саюзнага ўрада ў раёне.**

Як пракурор у справах рэвалюцыйнай законнасці з'яўляецца дзяржаўным вокам, так і вы ў справе выканання дзяржаўных абавязацельстваў па галоўнейшых прадуктах сельскай гаспадаркі — па хлебу, бульбе, мясу, малаку — з'яўляецеся дзяржаўным вокам, незалежным ад мясцовых арганізацый.

Чаго яшчэ не трэба забываць — гэта таго, што і сакратар райкома, і старшыня райвыканкома таксама павінны быць дзяржаўнымі дзеячамі. Значыць, вы ўсе трое — сакратар райкома, старшыня райвыканкома, райупаўкамзаг — з'яўляецеся дзяржаўнымі дзеячамі і перад усімі вамі як перад кіраўнікамі раённых арганізацый, ставяцца ў першую чаргу агульнадзяржаўныя задачы. Акрамя таго, як вы, так і раённыя кіраўнікі — вы-ж усе камуністы, і незалежна ад таго, на якое месца партыя каго паставі

*) Падаецца па жывому запісу.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы